# Адкрываецца доступ да выданняў ваеннага часу

---

- 27.12.2024 12:32

**Падчас Рэспубліканскага семінара па бібліятэчнай дзейнасці, які прайшоў у Нацыянальнай бібліятэцы, быў прэзентаваны праект «Назаўсёды ў нашай памяці: Хронікі ваенных гадоў па старонках цэнтральных газет Савецкага Саюза і партызанскім друку Беларусі (1941-1945 гады)». У яго межах з 1 студзеня па 30 чэрвеня 2025 года будзе адкрыты доступ да электронных версій нумароў такіх выданняў, як «Правда», «Известия», «Литературная газета», штотыднёвік «Огонёк», якія выходзілі ў ваенны час, а таксама да калекцыі газет партызан Беларусі.**

---

Прапанова далучыцца да гэтага праекта, прысвечанага 80-годдзю Перамогі, бібліятэкам Беларусі паступіла ад расійскай IT-кампаніі, якая спецыялізуецца на стварэнні электронных рэсурсаў, арыентаваных на ВНУ, бібліятэкі і дзяржаўныя арганізацыі.

Ваенныя выданні будуць даступныя для бібліятэк Расіі і СНД. Магчымасць працаваць з першакрыніцамі можа паслужыць для развіцця новых ініцыятыў. Па старонках перыёдыкі таго часу можна не толькі вывучаць ваенную хроніку, але і прасачыць, як змяняліся формы падачы матэрыялу, настрой, якія пасылы даносіліся чытачам. Таксама гэта магчымасць знаёміцца з работай журналістаў, фатографаў, мастакоў, плакатыстаў, карыкатурыстаў. Для чытачоў гэта яшчэ і крыніца для пошуку звестак пра родных.

Трэба сказаць, што Нацыянальная бібліятэка ўжо рэалізавала падобны праект. На сваім партале яна знаёміла чытачоў з ваеннай хронікай са старонак беларускіх выданняў 1944 года. Праект «Газетныя радкі чытаючы сэрцам» быў прымеркаваны да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На аснове гэтай працы нават выйшла асобная кніга.

Падчас Рэспубліканскага семінару па бібліятэчнай дзейнасці, арганізатарам якога разам з галоўнай кніжнай скарбніцай выступіла Міністэрства культуры Беларусі, яго ўдзельнікі расказалі пра рэалізаваныя імі патрыятычныя праекты, новыя формы работы з чытачамі. Таксама былі адзначаны лепшыя прадстаўнікі галіны.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**